**Тухта, В.** Пагранічнік / В. Тухта // Лепельскі край. — 2009. — 27 студз. — С. 2.

## ПАГРАНІЧНІК

Можна сказаць, што ўсё жыццё ўраджэнца Верабак Васіля Азаронка звязана з граніцай. Яшчэ ў гады Вялікай Айчыннай вайны Васілёў бацька Яўген Мікалаевіч ваяваў у партызанскай брыгадзе «Чэкіст» пад кіраўніцтвам афіцэра-пагранічніка Герасіма Кірпіча. Не пакінулі абыякавымі аповеды Герасіма Кірпіча пра мужнасць герояў-пагранічнікаў у гады вайны вясковага юнака. Ён цвёрда вырашыў стаць пагранічнікам. Пасля заканчэння сярэдняй школы № 2 г. Лепеля Васіля прызвалі на тэрміновую службу. Служыў на савецка-кітайскай мяжы. У 1967 г. пасля вучобы ў школе малодшых лейтэнантаў быў накіраваны намеснікам начальніка заставы ў Амурскую вобласць. Пасля заканчэння Далёкаўсходняга вышэйшага каманднага вучылішча яго прызначылі начальнікам заставы.

З 1974 па 1977 гады працаваў кур’ерам спецаховы пасольства СССР у Турцыі, за што быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пасля вяртання з-за мяжы зноў служыў начальнікам заставы на Далёкім Усходзе.

Першы раз у Афганістане Васілю Азаронку давялося пабываць у 1984 г. Камандзіроўка цягнулася сорак пяць дзён. Манеўраная група, начальнікам якой быў Васіль, ахоўвала газаправод. Чарговы раз трапіў у Афганістан у 1986 г. на дзесяць месяцаў. Прыкрывалі дзяржаўную мяжу СССР ад прарыву банд, а таксама трымалі пад кантролем караванны шлях, па якому маджахеды перапраўлялі з Ірана ў Афганістан зброю. Неўзабаве групу, у якой Васіль Азаронак быў начальнікам штаба, выкінулі высока ў гарах. Давялося абжывацца па суседству з духамі. Па дадзеных разведкі, колькасць апошніх даходзіла да дзвюх тысяч чалавек, а падраздзяленне пагранічнікаў налічвала ўсяго восемдзесят чалавек.

Васіль успамінае адзін выпадак, калі «духі» ў іх раёне вырашылі пераправіць вялікі караван са зброяй, але пагранічнікі замінал ім гэта зрабіць. Ноччу маджахеды пайшлі на штурм, але ў савецкіх воінаў было ўсё гатова для сустрэчы «гасцей». На поўную моц запрацавала батарэя мінамётаў, паляцелі ў ворага ручныя гранаты. Нападзенне адбілі, ніводны пагранічнік у баі не загінуў і нават не быў паранены.

За выкананне інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане Васіль Азаронак быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і медалём «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы СССР». У адстаўку выйшаў у званні маёра ў 1991 г., некалькі гадоў назад вярнуўся на пастаяннае месцажыхарства з Расіі ў Беларусь. Зараз жыве ў горадзе Жодзіна, але не забываецца на сваю малую радзіму – у Верабках бывае на працягу года не адзін раз.

У Васіля не толькі ўсё жыццё звязана з граніцай, але і ўсю яго сям’ю можна назваць пагранічнай. Старэйшы сын Вадзім пайшоў па бацькавых слядах, ён афіцэр ФСБ Расіі, ваяваў у Чачні. Зяць Аляксандр тэрміновую таксама служыў у пагранічных войсках. У Мінскім суvораўскім вучылішчы вучыцца ўнук Васіля Канстанцін і таксама ўжо прымярае на сабе дзядулеў кіцель з баявымі ўзнагародамі.

**В. Тухта**